А.А. Галкін,
прафесар кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

# Актуальныя аспекты вывучэння музычнай псіхалогіі ў павышэнні кваліфікацыі педагагічных работнікаў дзіцячых школ мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адукацыйным працэсе павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў дзіцячых школ мастацтваў асаблівае месца займаюць пытанні музычнага ўспрымання. Вобласць успрымання музыкі з'яўляецца састаўным элементам шырокай навуковай сферы, якая пазначаецца тэрмінам «музычная псіхалогія» («псіхалогія музыкі»)[1].

Калі ў навуцы асноўныя напрамкі даследаванняў музычнай псіхалогіі сфарміраваліся ўжо ў канцы 1940-х гг., то ў айчынную адукацыю псіхалогія музыкі пачала ўваходзіць толькі на пачатку 90-х гг. XX ст.

На сённяшні дзень вучэбная дысцыпліна «Музычная псіхалогія» трывала ўвайшла ў адукацыйныя праграмы ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў сферы культуры. За апошнія 20—25 гадоў апублікавана дастатковая колькасць даследаванняў, прысвечаных праблемам музычнай псіхалогіі [1—14; 18; 22—25], распрацаваны падручнікі [16; 19].

Існуючыя вучэбныя праграмы па тэмах музычнай псіхалогіі, нягледзячы на некаторую варыянтнасць, ахопліваюць пэўныя прадметныя вобласці і праблемы, звязаныя з псіхалогіяй музыкі. Гэта, перш за ўсё, прадметныя блокі, якія сфарміраваліся за апошнія два дзесяцігоддзі і ўключаюць наступную праблематыку: прадмет і аб'екты музычнай псіхалогіі, асноўныя напрамкі музычнай псіхалогіі; фізіка гуку і фізіялогія слыху; асоба, характар, тэмперамент, роля індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей асобы ў музычнай дзейнасці; музычнае ўспрыманне; структура музычных здольнасцей, музыкальнасць у структуры спецыяльных здольнасцей, эмоцыі ў музыцы і музычнай дзейнасці; музычны слых: віды, асаблівасці фарміравання і развіцця; рытмічнае пачуццё ў музычнай дзейнасці; памяць у музычнай дзейнасці і фарміраванні эстэтычных установак, працэсы музычнай памяці, памяць у музычна-выканальніцкай дзейнасці; псіхічныя працэсы ў музычнай дзейнасці, увага, арганізацыя музычнай увагі, уяўленне, мысленне; псіхалогія творчых працэсаў; псіхаматорыка ў дзейнасці музыканта-выканаўцы, выканальніцкія навыкі. Да дадзеных асноўных блокаў дадаюцца такія, як гісторыя развіцця музычнай псіхалогіі, псіхалагічныя асновы музычнага навучання,

[1] У большасці выпадкаў гэтыя тэрміны ў навуцы выкарыстоўваюцца як сінонімы.

псіхатрэнінг музыканта (уключаючы пытанні эстраднага хвалявання), музыкатэрапія.

Такім чынам, выкладанне музычнай псіхалогіі, з аднаго боку, фарміруецца з апорай на навукова-даследчы апарат агульнай псіхалогіі (на яе прынцыпах часцей за ўсё выбудоўваецца алгарытм тэматычнага матэрыялу ўсяго курса (дзейнасць, пазнавальныя працэсы, эмацыянальна-валявая сфера, індывідуальныя асаблівасці асобы, псіхалагічныя тэсты па выяўленню індывідуальных і прафесійных якасцей), з другога — уключае ўласна «музычную» спецыфіку, дзе прадметам вывучэння становяцца спецыфічныя псіхічныя акты, псіхалагічныя працэсы і ўласцівасці асобы, звязаныя з музыкай і музычнай дзейнасцю, а таксама праламленне псіхічных з'яў у музычнай мове і структуры музычных твораў.

Падобная шматаспектнасць праграмы па музычнай псіхалогіі, цалкам натуральная ў рамках адукацыйных праграм устаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў сферы культуры, дыктуе неабходнасць актуалізацыі тых ці іншых праблем псіхалогіі музыкі ў кантэксце рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў дзіцячых школ мастацтваў.

У 90-я гг. XX ст. і ў першае дзесяцігоддзе XXI ст. пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў дзіцячых школ мастацтваў мэтазгоднай была аглядная, тэзісная трансляцыя матэрыялу праграмы музычнай псіхалогіі, г.зн. свайго роду ўвядзенне ў псіхалогію музыкі з выяўленнем яе прадметных сфер. Гэта было абумоўлена тым, што ў названы перыяд большасць настаўнікаў дзіцячых школ мастацтваў, якія асвойвалі адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі, мелі вельмі вузкае ўяўленне аб музычнай псіхалогіі. У гады іх базавага прафесійнага навучання музычная псіхалогія яшчэ не ўваходзіла ў вучэбныя планы ўстаноў адукацыі ў сферы культуры.

На сучасным этапе, калі многія з настаўнікаў ужо маюць пэўныя веды з базавай праграмы музычнай псіхалогіі, у рамках павышэння кваліфікацыі найбольш актуальнымі становяцца аспекты, звязаныя з музычна-педагагічнай псіхалогіяй (перш за ўсё веды пра музычны слых, аналіз музычных здольнасцей і шляхоў іх развіцця), выхаваннем і навучаннем юных музыкантаў.

Акцэнтаваны разгляд гэтых пытанняў найбольш перспектыўны як у навуковым, так і ў методыка-практычным сэнсе. З пазіцый псіхалогіі музыкі асноўны падыход да праблемы заключаецца ў псіхолага-педагагічным аналізе фарміравання здольнасці да ўспрымання музыкі.

У метадалагічным плане дадзены падыход да найбольш актуальных педагагічных аспектаў музычнай псіхалогіі ўключае, паводле класіфікацыі М. Старчэус, 5 неіерархічных узроўняў (пластоў) псіхалогіі музыкі [20]:

1. *Псіхалогія музычных здольнасцей* — разгляд псіхалагічных аспектаў канкрэтных відаў музычнай дзейнасці, музыкальнасці, тэорыі і тыпалогіі музычных здольнасцей, праблематыкі музычнага таленту і адоранасці, навучання музыцы, антагенезу музычных здольнасцей, методык іх ацэнкі і прагназавання і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Псіхалогія музычнага слыху* — аналіз адчування (успрымання) асобных параметраў музычнага гуку і гучання, строяў, ладоў, кансанансу і дысанансу, разгляд пытанняў сінестэзіі, тыпалогіі музычнага слыху, паталогіі і гігіены музычна-слыхавой дзейнасці і інш.
3. *Псіхалогія ўспрымання музыкі* (разглядаецца як асобы від музычнай актыўнасці) — выяўленне дэтэрмінант гістарычнага развіцця музычнага ўспрымання, тыпалогіі рэцэптыўных актаў, фарміраванне музычнай успрымальнасці, спецыяльнае прымяненне ўспрымання музыкі (у музыкатэрапіі, працоўных працэсах), псіхалогія музычнага перажывання, у тым ліку спецыфічныя псіхалагічныя аспекты ўздзеяння музыкі на чалавека, накіраванасці музыкі на ўспрыманне слухача, сацыяльныя аспекты музычнага ўспрымання, псіхалагічныя фактары музычнага густу, псіхалагічную праблематыку функцый музыкі і інш.
4. *Псіхалогія музычнай творчасці* — аналіз творчага працэсу ў музыцы (фазы, прадуктыўнасць, тыпалогія), псіхалагічных фактараў мастацкай індывідуальнасці (перадумовы, фарміраванне, тыпалогія) і інш. У дадзены блок уваходзіць і псіхалогія музычнага выканальніцтва.
5. *Псіхалагічныя аспекты музычных феноменаў* — аналіз псіхалагічных асноў музычнай мовы, формы і фактуры музычных твораў, стылю, жанру, узаемаабумоўленасці і праяваў руху, прасторы, часу як характарыстык музыкі і інш.

У працэсе рэалізацыі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі вузлавым момантам педагагічнага падыходу да музычнай псіхалогіі павінны стаць праблемы фарміравання і развіцця музычнага слыху.

Зыходнай навукова-метадычнай крыніцай можа быць фундаментальнае даследаванне М. Старчэус, прысвечанае праблемам музычнага слыху [21], у якім падводзяцца вынікі і абагульняюцца даныя даследаванняў музычнага слыху ў шырокім гістарычным кантэксце.

Галоўным вектарам педагагічнага спасціжэння таямніц музычнага ўспрымання, законаў яго фарміравання з дзіцячага ўзросту павінна стаць усведамленне, што «слых чалавека становіцца музычным толькі тады, калі акустычныя ўласцівасці гуку пераўтвараюцца ў музычныя якасці» [21, с. 14], г.зн. калі гук пераўтвараецца ў нашым успрыманні ў музычны тон. Зразумець гэты працэс можна толькі з пазіцый музычнай псіхалогіі. Практыка паказвае, што «апора на даныя псіхалогіі музычнага ўспрымання з’яўляецца адной з умоў глыбокага пранікнення ва ўласныя законы музыкі» [6]. Пра гэта сведчыць і сама гісторыя развіцця музычнай псіхалогіі.

Першы этап у гісторыі псіхалогіі музыкі асвятляе праца Германа фон Гельмгольца [15], у якой разглядаюцца пытанні фізіялогіі музычнага слыху. Наступны этап у гісторыі псіхалогіі музыкі звязаны з імем Карла Штумпфа [26] і распрацоўкай навукі аб слыху з псіхафізіялагічнага пункта гледжання. Зараджэннем уласна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычнай псіхалогіі, псіхалогіі музычнага ўспрымання мы абавязаны Эрнсту Курту, аўтару кнігі «Музычная псіхалогія» [17]. Курт абгрунтоўвае псіхалогію музычнага слухання («музыкального слышания»). Менавіта ён убачыў у музычным дараванні «загадку души, а не слуха» [5; 17, с. 69].

Каб усвядоміць, што музычны слых — больш чым слых, патрабуецца прааналізаваць некаторыя паняцці тэорыі слыху.

У першую чаргу неабходна разгледзець асаблівасці фарміравання слыху і крытэрыі яго сфарміраванасці. Важна прытрымлівацца менавіта псіхалагічных крытэрыяў, якія выводзяць да паняцця слыхавых стратэгій у музычным успрыманні.

Наступны крок — выяўленне ўласцівасцей прафесійнага музычнага слыху, у цэнтры якіх феномен «зоннай прыроды» слыху (тэрмін савецкага акустыка і тэарэтыка музыкі М. Гарбузава). Гэта і спрыяе пераасэнсаванню акустычных уласцівасцей гуку, калі тон фактычна выходзіць за свае акустычныя межы і набывае музычныя якасці. Менавіта на гэтым этапе асэнсавання працэсаў фарміравання музычнага ўспрымання мы пераходзім ад сферы музычнай акустыкі ў вобласць музычнай псіхалогіі.

«Доказная база» дадзенага тэзіса звязаная з параўнальным аналізам акустычнага і музычнага вобраза гучання. У выніку атрымліваем уяўленне аб тым, *што* прыўносіць у пачуццёвую гукавую тканіну музычны слых. Менавіта такім чынам найважнейшыя музычна-слыхавыя адчуванні (гучнасць, тэмбр, працягласць, вышыня) становяцца псіхалагічнымі феноменамі. З метадалагічнага пункта гледжання аказваецца, што кожны музычны феномен (гук, тэмбр, гучнасць, вышыня і інш.) мае дваістую прыроду — акустычную і псіхалагічную.

Зразумела, што цэнтральным пры псіхалагічным падыходзе да праблем успрымання становіцца феномен вышыні — гукавышыннага слыху музыканта. З пункта гледжання музычнай псіхалогіі некалькі іншае асвятленне, якое адрозніваецца ад агульнапрынятага акустыка-фізіялагічнага падыходу, атрымліваюць пытанні абсалютнага і адноснага слыху. З двума відамі слыху звязаная двaістасць абсалютнага і адноснага эфекту любога музычнага феномена, што абумоўлена законамі ўласна музычнага ўспрымання. Пры гэтым адносны эфект з'яўляецца псіхалагічным па сваёй прыродзе. Такім чынам, менавіта адносны слых аказваецца бясспрэчным выяўленнем музычнага слухання. А ўсе ўласна музычныя феномены (лад, кансанантнасць, дысанантнасць, ладавае прыцягненне, маляўнічасць, гукавы рух і да т.п.), з'яўляючыся вынікам слыхавога ўкаранення «псіхічных энергій» (паводле Э. Курта) у гукавую матэрыю, аказваюцца псіхічнымі феноменамі ўспрымання, г.зн. маюць не столькі акустычную, колькі безумоўна музычную прыроду. Магчыма менавіта тут «и скрывается таинство превращения акустических характеристик тонов и созвучий в музыкальные» [21, с. 226].

Прапанаваны падыход, які заснаваны на законах музычнай псіхалогіі, дасць педагагічнаму работніку магчымасць глыбей пранікнуць у праблемы музычных здольнасцей, музычнага развіцця навучэнцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Галкин, О.* Введение в музыкальную психологию (на основе энергетической концепции Эрнста Курта) / О. Галкин // Психология музыки и музыкальных способностей : хрестоматия / сост.-ред. А. Е. Тарас. — М. : АСТ; Минск : Харвест, 2005. — С. 361—616. — (Сер. «Библиотека практической психологии».)
2. *Галкин, О.* Концепция музыки Эрнста Курта : от психологизма к онтологизму / О. Галкин // Методологическая функция христианского мировоззрения в музыкознании : межвуз. сб. науч. ст. / отв. ред.-сост. В. В. Медушевский. — М. ; Уфа : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, Уфимская гос. академия искусств им. З. Исмагилова, 2007. — С. 108—123.
3. *Галкин, О.* Методологические принципы музыкальной психологии (энергетическая концепция Э. Курта) / О. Галкин // Методология современного музыкознания : Экспериментальный курс : тезисы лекций для студентов отделения музыковедения / ред.-сост. Н. Шиманский. — Минск : БГАМ, 1992. — С. 61—67.
4. *Галкин, О.* Музыкальная психология как учебная дисциплина / О. Галкин // Чалавек. Культура. Адукацыя : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф. (г. Мінск, 2003 г.) / навук. рэд. У.П. Скараходаў. — Мінск : БелДІПК, 2003. — С. 31—34.
5. *Галкин, О.* Музыкальная психология : проблемы предметного поля и содержания / О. Галкин // Культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф. (25—26 лістапада 2009 г.) / рэд. савет: Б. Святлоў (старшыня) [і інш.]. — Мінск : БДУКіМ, 2010. — С. 250—255.
6. *Галкин, О.* Музыкальная психология : проблемы предметного поля и содержания [Электронный ресурс] / О. Галкин. — Режим доступа : http://repository.buk.by:8080/jspui/bitstream/123456789/2386/1/MUZYIKAL'NAYA%20PSIHOLOGIYA.pdf. — Дата доступа : 28.03.2016.
7. *Галкин, О.* Музыкальная психология : программа для муз. вузов / О. Галкин. — Минск : БГАМ, 2005. — 21 с.
8. *Галкин, О.* Музыкальная психология : программа для слушателей факультета повышения квалификации руководящих работников и специалистов культуры / О. Галкин. — Минск : БелГИПК, 2002. — 8 с.
9. *Галкин, О.* Области и границы музыкальной психологии : перевод и комментарии к отрывку из книги Э. Курта «Музыкальная психология» / О. Галкин // Homo musicus: Альманах музыкальной психологии'94 / ред.-сост. М. Старчеус. — М. : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, 1994. — С. 7—36.
10. *Галкин, О.* Психолого-стилистическая сущность мелодики : барокко и классицизм / О. Галкин // Вечные ценности музыки (к 250-летию со дня смерти И.С. Баха) : материалы науч. конф. — Минск : БГАМ, 2001. — С. 17—21.
11. *Галкин, О.* Слух и слышание : Проблема музыкальной одаренности / О. Галкин // Сучасныя методыкі музычнага выхавання : праблемы развіцця музычных здольнасцей у класе сальфеджыа : тэзісы рэсп. навук.-практ. канф. — Мінск : БелІПК, 1994. — С. 9—14.
12. *Галкин, О.* Теоретические проблемы музыкальной психологии : на основе энергетической концепции Эрнста Курта : монография / О. Галкин. — Минск : БелИПК, 2000. — 164 с. — (Сер. «Информационно-аналитические материалы».)
13. *Галкин, О.* Тонпсихология и музыкальная психология : перевод и комментарии к отрывку из книги Э. Курта «Музыкальная психология») / О. Галкин // Homo musicus: Альманах музыкальной психологии'2001 / ред.-сост. М. Старчеус. — М. : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, 2001. — С. 7—54.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Галкин, О.* Учение о музыкальной психологии Эрнста Курта в контексте мирового и отечественного музыкознания / О. Галкин // Веснік Беларус. дзярж. ін-та праблем культуры. — 2003. — № 1. — С. 37—47.
15. *Гельмгольц, Г.* Учение о слуховых ощущениях как физиологическая основа для теории музыки / Г. Гельмгольц. — СПб. : Тов-во «Общественная польза», 1875. — 595 с.
16. *Готсдинер, А.Л.* Музыкальная психология / А. Л. Готсдинер. — М. : Магистр, 1993. — 194 с.
17. *Курт, Э.* Музыкальная психология / Э. Курт; пер. с нем. Л. Товалевой, О. Галкина, вступ. ст. О. Галкина; коммент. О. Галкина, М. Старчеус; науч. ред. М. Старчеус. — Минск : БелГИПК, 2007. — 496 с.
18. Музыкальная психология : хрестоматия / сост. М. Старчеус. — М. : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, 1992. — 425 с.
19. *Петрушин, В.И.* Музыкальная психология : учеб. пособие для вузов / В.И. Петрушин. — М. : Академ. проект; Трикста, 2008. — 400 с.
20. *Старчеус, М.С.* Музыкальная психология [Электронный ресурс] / М.С. Старчеус. — Режим доступа : http://wiki.myword.ru/index.php/. — Дата доступа : 28.03.2016.
21. *Старчеус, М.* Слух музыканта : монография / М. Старчеус. — М. : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, 2003. — 640 с. — (Сер. «Психология: о музыкантах, для музыкантов».)
22. Homo musicus : Альманах музыкальной психологии / ред.-сост. М.С. Старчеус. — М. : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, 1994. — 206 с.
23. Homo musicus : Альманах музыкальной психологии'95 / ред.-сост. М.С. Старчеус. — М. : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, 1995. — 176 с.
24. Homo musicus : Альманах музыкальной психологии'99 / ред.-сост. М.С. Старчеус. — М. : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, 1999. — 180 с.
25. Homo musicus : Альманах музыкальной психологии'2001 / ред.-сост. М.С. Старчеус. — М. : Моск. гос. консерватория им. П.И. Чайковского, 2001. — 228 с.
26. *Stumpf, C.* Tonpsychologie: 2 Bde. — Leipzig: Hirzel, 1883—1890. — 654 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ